Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27. № 22 (480)

ДАЧНЫЯ ХІТРЫКІ

Сакрэты кукурузы

Усе пасынкі, якія дасягнулі 20-25 см, выломліваем. Можна гэта рабіць і раней, але такія добра скарыстаць на корм трусам і козам. Суквецці (мяцёлкі) нахіляем адно да аднаго і трасем для лепшага апылення і фарміравання зерняў. Абразаем іх, калі завяжуцца пачаткі. Так да апошніх паступіць больш пажыўных рэчываў і яны вырастуць больш буйнымі.

Памідоры будуць буйнымі

Калі вырошчваць таматы ў адно сцябло з выдаленнем усіх пасынкаў, гэтую працэдуру даводзіцца паўтараць 15-30 разоў за сезон, інакш таматы вырастуць дробнымі і нясмачнымі.

У канцы ліпеня — пачатку жніўня выдаляем (зразаем) верхнюю кропку росту, а затым часткова абразаем лісце — так наліў памідораў ідзе больш інтэнсіўна. На расліне пакідаем па 6-7 пладовых суквецццяў. Калі завязяў занадта шмат, то ў кожнай пладовай гронцы пакідаем па 5-7 пладоў, астатнія выдаляем. На кусце атрымліваецца, у залежнасці ад велічыні, 30-40 пладоў.

Пры неабходнасці падкормліваем настоем крапівы, падтыннику, багатак, падбелу двойчы за сезон. Настой ужываем не пазней, чым праз двое сутак пасля закладкі зёлак, інакш пасля закісання атрымліваецца квас або брага. Плады здымаем, калі яны мяняюць афарбоўку з зялёнай на белаватую або ружовую. Даспельваем адзін-два тыдні. Захоўваюцца памідоры ў свежым выглядзе, у залежнасці ад тэмпературы і вільготнасці паветра, да паўтара месяца.

ХВАРОБЫ СЛІЎ

Каб атрымаць добры ўраджай сліў, трэба надаць увагу абароне ад хвароб.

Кластэраспарыёз, ці дзіркаватая плямістасць, — захворванне ўсіх костачкавых дрэў. Выяўляецца практычна на ўсіх частках дрэва — кветках, пладах, пупышках, лістоце, галінках. На кожнай частцы дрэва хвароба выяўляецца парознаму: карычневыя плямы з малінавай акантоўкай на лістоце, на пладах — упадзінкі, якія паступова ператвараюцца ў бародаўкі, пупышкі чарнеюць. На галінках хвароба выяўляецца спачатку чырвонымі плямамі, якія пасля становяцца язвай з вылучэннем камедзі. Любы заражаны ўчастак паступова памірае. **Лячэнне**. *Па восені збярыце лісце ў кучы і закапайце пад пластом торфу ці проста ў зямлю. Для прафілактыкі можна апырскаць дрэвы бардоскай вадкасцю (1:100) ці растворам меднага купарвасу (1:100).*

Кокамікоз. Часцей пашкоджвае іншыя дрэвы (сямействы вішні), але і слівовыя таксама хварэюць. Пашкоджвае лісце (маленькія чырвоныя плямы, якія растуць), зялёныя плады, парасткі, якія яшчэ не апрацянелі. **Лячэнне**. *Спальванне лістоты, якая апала. Апырскванне растворам, як пры кластэраспарыёзе.*

Маніліяльны апёк (маніліёз, шэрая гніль). Хвароба паходзіць ад грыбка. Прыкмета — рэзкае засыханне галінак, кветкі пачынаюць бурэць. Калі хвароба пачынае бурна развівацца, дрэва становіцца падобным на абгарэлае ці абпаленае (адкуль і атрымала сваю назву). У летні перыяд хвароба прагрэсіруе ў выглядзе гнілі на пладах. Грыбок жыве ў парастках, кветках і на пладах. Добра развіваецца пры вільготным надвор'і. **Лячэнне**. *Знішчэнне ўсіх заражаных частак шляхам спальвання. Пры выдаленні заражаных участкаў неабходна выразаць разам са здаровым целам (каля 20 см). Пераносчыкам заразы могуць выступаць насякомыя. Для прафілактыкі неабходна праводзіць апырскванне растворам «Скора» ці «Тапсін-М» (3:100) перад цвіценнем і бардоскай вадкасцю ў перыяд лістападу (3:100)*

Кішэнькі слівы. Як і ў выпадку маніліёзу, узбуджальнікам выступае грыбок. Прадметам заражэння з'яўляюцца, галоўным чынам, плады, радзей — кветкі. Момант заражэння — цвіценне дрэва. Прыкметы заражэння — плод фарміруецца без костачкі і мае стручкападобную форму. Спрыяльнымі ўмовамі для развіцця хваробы з'яўляюцца павышаная вільготнасць, позняе цвіценне. **Лячэнне**. *Знішчэнне пашкоджаных пладоў да таго, як грыб пачне размнажэнне. Робіцца апырскванне бардоскай вадкасцю (3:100), медным купарвасам (1:100).*

Ведзьмін венік. Прычына ўзнікнення хваробы — грыбок. Месца развіцця — галінкі. Прыкметамі развіцця хваробы з'яўляецца ўтварэнне мноства слабых тоненькіх атожылкаў, якія нагадваюць венік. На гэтых атожылках расце лісце бледнага колеру і недаразвітай формы, у ніжняй частцы якога з часам утвараецца шараваты налёт — грыбок. Пасля паспявання грыбок ветрам разносіцца па ўсім дрэве і на суседнія дрэвы. **Лячэнне**. *З хваробай паступаюць таксама, як у сярэднія вякі паступалі з ведзьмамі: знаходзяць, збіраюць у кучу і нішчаць агнём. Для прафілактыкі ранняй вясной дрэвы неабходна апырскваць медным купарвасам (1:100).*

Млечны бляск. Самае небяспечнае з грыбковых захворванняў. Лісце на зліве набывае серабрысты колер. Хвароба пашкоджвае адну галінку за другой. Па сасудах хвароба хутка распаўсюджваецца па ўсім дрэве, ад чаго апошняе хутка гіне. **Лячэнне**. *Як толькі заўважылі серабрысты налёт, неадкладна трэба выразаць і выдаліць пашкоджаную галіну. Калі гэтае месца знаходзіцца на ствале ці ў кары дрэва, трэба зачысціць і апрацаваць паверхню медным купарвасам (3:100) ці жалезным купарвасам (4:100). Калі дрэва не выратаваць — яго неабходна выкарчаваць.*

Воспа. Хвароба развіваецца з віруса. Выяўляецца на 3-4 тыдні ад цвіцення на лісці светлымі плямамі, палосамі. На пашкоджаным плодзе праступаюць цёмныя палосы і плямы, ці пашкоджанае месца можа быць іржавага колеру. Плод спее на 3-4 тыдні раней за тэрмін і ападае. Галоўны пераносчык воспы — тля. **Лячэнне**. *Знішчэнне пустазелля і раслін каля ствала дрэва. Заражаныя ўчасткі выдаляюцца, калі пашкоджана ўсё дрэва — яго неабходна выкарчаваць. Ад воспы няма хімабароны.*

Некратычная колцавая плямістасць. Лісце, пашкоджанае гэтым захворваннем, спачатку мае карычневыя плямы, а затым ападае. Хвароба падобная на дзіркаватую плямістасць, але без малінавага акаймлення. **Лячэнне**. *Пашкоджаныя ўчасткі выдаляюцца, дрэвы — выкарчоўваюцца, бо лекаў ад гэтай хваробы няма.*

Змагаемся з каларадскім жуком

Гэтую аперацыю неабходна правесці, калі цалкам сабраны ўраджай, а бацвінне высахла, ці вясной, калі бульба ўжо пасаджана і да ўсходаў застаецца тыдзень.

Трэба нарэзаць бульбу на часткі і, паклаўшы ў раствор хларафосу, вытрымаць там суткі. Потым раскідаць прынады па гародзе, асабліва там, дзе будзе расці бульба. Зрабіць гэта лепш у пахмурнае надвор'е або на ноч, таму што на сонцы кавалачкі клубняў хутка засыхаюць. Жук накідваецца на атручаную бульбу і гіне.

Для барацьбы з каларадскім жуком можна ўжываць і пасткі. Бяруць кансервавыя бляшанкі, добра мыюць і нават кіпяцяць. Беражкі бляшанак змазваюць бульбяным сокам, а ў бляшанкі кладуць 3-4 кавалачкі бульбы. Бляшанкі выстаўляюць на ўчастак з разліку адну, прыкладна, на 5 кв. м. «Аперацыю» гэтую праводзяць апоўдні, а ўвечары пасткі збіраюць. Злоўленых жукоў знішчаюць. Бульбу ў якасці прынады выкарыстоўваюць два-тры разы.

■ Прыгажосць — ёсць!

НАКЛАДНЫЯ ПАЗНОГЦІ ВЫНАЙШАЎ... ДАНТЫСТ

Кожная жанчына марыць аб тым, каб быць цалкам дасканалай, да апошняга пазногця. Каб быць прыгожай, дагледжанай, патрэбны не толькі грошы і час, але і адпаведныя веды.

Вядома, што менавіта рукі здольныя расказаць аб сваёй гаспадыні шмат — узрост, сацыяльны стан і г.д. Вядома, мала хто можа пахваліцца дасканалым, бездакорным штодзённым манікюрам. Каб вас успрымалі так, як хочацца менавіта вам, ёсць некалькі сакрэтаў. Адзін з іх — дэкаратыўнае аздабленне пазногцяў.

З гісторыі вядома, што нават у часы фараонаў у Егіпце пазногці фарбавалі хной. Па колеры можна было вызначыць становішча чалавека: калі пазногці былі ярка-чырвоныя — гэта быў фараон; жрацы фарбавалі іх у чорны колер, а ў людзей сярэдняга класа пазногці былі пастэльных адценняў.

Сучаснае жыццё вымагала новых адкрыццяў: радзімай штучных пазногцяў сталі ЗША. Бо там Галівуд стварыў сапраўдную індустрыю прыгажосці. Ад тысяч акцёраў і актрыс патрабавалася дасканаласць ва ўсім.

Але першыя «аксесуары прыгажосці» былі вельмі дарагімі: куплялісь чужыя адрэзаныя пазногці, якія потым наклейвалі. Яны трымаліся вельмі кароткі час. Таксама выкарыстоўвалі ў якасці аздаблення розныя сінтэтычныя матэрыялы. Рэвалюцыя ў справе нарошчаных пазногцяў адбылася ў 1970-я гады.

Гісторыя не захавала імя стаматолага, які першы вырашыў рэанімаваць свой зламаны пазногаць, узмацніўшы яго акрылам, які выкарыстоўваў для зубных пломбаў. Вельмі хутка гэтае ноу-хау атрымала распаўсюджванне. Але стаматалагічны акрыл быў не самым лепшым матэрыялам для пазногцяў: дарагі, небяспечны для «жывых» пазногцяў, бо «схопліваўся» з імі намёртва, і потым ледзьве аддзіраўся. Вось з тых часоў ідзе пагалоска аб тым, што акрыл і гель нарошчаных пазногцяў небяспечны. Тагачасны — так. Але хімікі працавалі, тэхналогіі развіваліся. Сучасныя матэрыялы не алергічныя, гнуткія, але трывалыя, дазваляюць рабіць самыя адмысловыя формы пазногцяў.

Ёсць яшчэ некалькі міфаў аб шкоднасці штучных нарошчаных пазногцяў. Напрыклад, такі: накладныя пазногці замінаюць рабіць хатнія справы. Але можна падабраць аптымальную даўжыню, увогуле можна зрабіць іх такімі, што ніхто нават нічога і не западозрыць. Калі «штучнасць» (не бяром у разлік экзатычную даўжыню ці адметны дэкор) кідаецца ў вочы, то гэта няякасная работа майстра, альбо яго першыя крокі, ці ўвогуле дрэнны матэрыял.

На ўсе пытанні аб шкоднасці нарошчаных пазногцяў мой адказ просты. Гэта як з фарбай для валасоў: калі яна няякасная, набытая ў сумнеўным месцы, то і вынік можа быць самы нечаканы і для колеру валасоў, і для іх агульнага стану. Так і штучныя пазногці.

Жанчыны выбіраюць нарошчванне па розных прычынах. Камусьці проста даспадобы быць дасканалай да мезенца. Калі жанчыне кожны дзень трэба выглядаць бездакорна, ёй прасцей знайсці некалькі гадзін «на прыгажосць» раз на 3-4 тыдні, чым 30 хвілін штодзённа. Бо свае пазногці патрабуюць частага манікюру, карэкцыі колеру і г.д. Штучныя выглядаюць дагледжанымі месяц. Акрамя таго, тэхналогіі дазваляюць мадэляваць ідэальны пазногаць, нягледзячы на заганы натуральнага.

Ёсць яшчэ адна катэгорыя людзей, каму штучныя пазногці вельмі неабходныя, — жанчынам, якія маюць дрэнную звычку іх грызці. Штучны пазногаць бароніць асабісты ад агрэсіўнага ўздзеяння вонкавага асяроддзя — бытавой хіміі, хлараванай вады і г.д. Мая маці, якой такое прыгожае вынаходніцтва прыйшлося даспадобы, займаецца кветкамі, мае справу з зямлёй. Якія б ні былі брудныя рукі, штучныя пазногці пасля мыцця са шчоткай выглядаюць бездакорна. Паспрабуйце адшураваць натуральныя пазногці ад чарніц ці бульбы да бляску!

Нарошчаныя ногці спрыяюць таму, што куцікула пачынае расці марудна — так адпадае неабходнасць у частых манікюрных працэдурах. Можна забыцца і на завусеніцы.

У мяне нярэдка пытаюцца: як адрозніць якасную работу майстра па пазногцях? Незалежна ад класа салона трэба на свае вочы пабачыць прыклады работы. У прафесіянала заўжды ёсць партфоліа. Зразумела, «шавец без ботаў», але абавязкова хтосьці з персаналу салона можа пахваліцца манікюрам ад майстра. На што трэба звяртаць увагу ў першую чаргу: пазногаць павінен быць эстэтычным, даволі тонкім, выглядаць натуральна. Увогуле, жанчыны, што робяць гэтую працэдуру не першы раз, здольныя ўжо самі вызначыць кваліфікацыю майстра з першага позірку.

Наташа КАРАЛЁВА.

На фотаздымках: узоры аздаблення накладных пазногцяў. Трэнд лета 2013 года.

Даты | Падзеі | Людзі

1588 год — няўдачай завяршыўся паход так званай «Непераможнай армады» — іспанскага флоту, які адплыў у маі з Лісабона з мэтай заваявання Англіі. Армада складалася са 130 караблёў (8000 маракоў і 19000 салдат). Іспанскія караблі саступалі англійскім у хуткасці і ўзбраенні, але іспанцы спадзяваліся, што ім удасца навязаць абардажны бой і тады ўсё вырашыць пяхота. Англічане выставілі меншыя па памеры і больш манеўраныя караблі з моцнай артылерыяй. У Ла-Маншы англійскі флот пад камандаваннем адмірала Фрэнсіса Дрэйка і лорда Ховарда некалькі разоў атакаваў іспанцаў. У баях, якія доўжыліся больш за тыдзень (з 31 ліпеня па 8 жніўня), «Непераможная армада» страціла больш за 20 караблёў і была вымушана рушыць вакол Брытанскіх астравоў назад у Іспанію. Каля берагоў Ірландыі іспанскі флот трапіў у моцны шторм і страціў яшчэ 40 караблёў. У выніку каля паловы «Непераможнай армады» было знішчана і Іспанія фактычна страціла статус вялікай марской дзяржавы..

1900 год — у Бостане па ініцыятыве студэнта Гарвардскага ўніверсітэта Дуайта Дэвіса адбыўся першы міжнародны тэнісны турнір — матч тэнісістаў ЗША і Англіі. Дата нараджэння Кубка Дэвіса — неафіцыйнага чэмпіянату свету сярод мужчынскіх тэнісных каманд.

1953 год — 60 гадоў таму нарадзіўся (вёска Жгуна-Буда Добрушскага раёна) Уладзімір Іванавіч Пракапцоў, беларускі мастацтвазнаўца, мастак, кандыдат мастацтвазнаўства (1984), заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (2013). З 1980 года працаваў у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, з 1998-га — дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Даследуе праблемы сучаснага выяўленчага мастацтва. Працуе ў станковым жывапісе ў жанрах нацюрморта, пейзажа, тэматычнай карціны. Лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2007).

Было сказана

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, пісьменнік, драматург:

«Дык і ў тых, пра каго кажуць:
душы іх з лёду —
Растае лёд
у танцы жыцця і свабоды».



Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. г. Дзяржынск.

«Хай будзе хлеб! І чыстыя крыніцы!»

Па гарызанталі: 1. «Жніце, ... маладыя,\\Вашы сярпы залатыя!». З дажынкавай песні «Залатая мяцёлачка». 5. «Прасіўся снапочак у дзевачак:\\-Ой, звіце, дзевачкі, ... ,\\Занясіце мяне ў стадолу». З зажынкавай песні «Прасіўся снапочак»: песня прысвечалася першаму снапу-гаспадару. 10. «З сука на ..., з галінкі на галінку\\Перасмыкае восеньскі агонь». («Верасень». С.Дзяргай). 11. «Сядзьце, жнейкі, у халадочку,\\Піце ... па кубачку». З дажынкавай песні «Палуднічкі загудзелі». 12. Найсмачнейшы ... — ад сваёй працы (прык.). 13. «Рада, рада наша ... ,\\Што жыта дажала, рада, рада». З дажынкавай песні «Рада перапёлка». 14. «Апахмялятар» (жарт.). 17. «Сакавітыя ... мурожныя\\Не заменіш нічым і нідзе». З песні «Жураўлі на Палессе ляцяць» (сл. А.Ставера, муз. І.Лучанка). 19. «Вось прыйшлі і жнейкі ў ...\\Заскакаў крывы сярпок». («Жніўныя песні». Я.Колас). 20. «Багаты ўраджаямі ...,\\Буяюць, пяюць каласіста». («Паклон мой народу за песні». Я.Купала). 23. «Што за казка — восеньскае ... !\\Што за дзіва — лісця карагод!» («Колькі жа навокал прыгажосці». Т.Дзям'янава). 24. Горы ў Заходняй Еўропе. 29. «Ой, па аблозе скакалі козы,\\Дажалі жытка ... гожы». З дажынкавай песні «Дажалі жытка аж да аблогу». 31. Хто мае ..., у таго вясна позняя, хто не мае — ранняя (прык.). 32. «Пасылае Ваню ...\\Яравое жыта жаці:\\-Ступай, Ваня, сажні!» З беларускай народнай песні «Пасылала Ваню ...». 33. «Ой, я жала, не ляжала,\\За дзень ... снапкі нажала». З дажынкавай песні «Ой, я ў бары жыта жала». 34. «Па нашаму полю беглі ...,\\Дажалі жытка красны малодкі». З дажынкавай песні «Па нашаму полю». 35. «Дзякуем табе, наш моцны божа,\\Што нам дапамог сабраці ...». З дажынкавай песні «Дзякуем табе».

Па вертыкалі: 2. Рака ў Расіі. 3. Недаспелы ... не жнуць (прык.). 4. «Граў на скрыпачцы камар,\\На дудачцы — чмель-...». («Рак-вусач». Я.Колас). 6. Калі ўрадзіла ляшчына, то ўродзіць і ... (прык.). 7. Краіна ў Лацінскай Амерыцы. 8. Тое, што і кабета (разм.). 9. Выслоўе (кароткая цытата), што змяшчаецца перад творам. 15. «... ў нас дажыначкі,\\Прынясе пан гарэлачкі». З дажынкавай песні «... ў нас дажыначкі». 16. «... было,\\Розна зеллечка цвіло;\\Восень настала,\\Розна зеллечка звяла». З песні «Ой, восень, восень». 17. «Жыта, сынку, жыта, сынку,\\Жыта не ...,\\Як ту дзеўку не любіці -\\Яна чараўніца». З дажынкавай песні «Жыта ў полі». 18. «Хай будзе хлеб ! І чыстыя крыніцы !\\Відаць, таму начамі ў ... зорны\\Аж давідна трывожацца зарніцы». («Жнівеньскія зарніцы». В.Гардзей). 21. Плот, зроблены з часта ўбітых калкоў. 22. «Зноў верасень — запаслівы ...-\\Шчырує па імшыстых баравінах».(«Верасень». А.Грачанікаў). 25. Пра таго, хто ўмее добра ездзіць. 26. Рака, левы прыток Нёмана. 27. Зямля — галоўны ... нашай Бацькаўшчыны (прык.). 28. Як кусок сала, то і ... патрава (прык.). 30. Сатырычнае або гумарыстычнае адлюстраванне каго-, чаго-небудзь.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Жнеўкі. 5. Вяночак. 10. Сук. 11. Піва. 12. Хлеб. 13. Гасцяўбіна. 14. Расон. 17. Ложкі. 19. Поле. 20. Нівы. 23. Сакта. 24. Альны. 29. Дзяўчаткі. 31. Корм. 32. Маці. 33. Тры. 34. Лябёдкі. 35. Збожжа.

Па вертыкалі: 2. Нява. 3. Колас. 4. Дуаар. 6. Ярына. 7. Чыні. 8. Кабеціна. 9. Зніграф. 15. Сябронна. 16. Пеценка. 17. Шаніца. 18. Жнівень. 21. Частаком. 22. Грыбнік. 25. Ядок. 26. Шчара. 27. Скарб. 28. Грыб. 30. Шарк.

СЁННЯ

Месяц
Маладзік 7 жніўня.
Месяц у сузор'і Льва.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.35	20.54	15.19
Віцебск	5.20	20.48	15.28
Магілёў	5.25	20.44	15.19
Гомель	5.28	20.35	15.07
Гродна	5.52	21.08	15.16
Брэст	5.58	21.03	15.05

Імяніны
Пр. *Праскоўі, Ермалая, Майсея.*
К. *Дамініка, Цыпрыяна, Эміліяна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Жонка — мужу:
— Давай, я памыю галаву, а ты — посуд і падлогу.

Калі ўжо ў мабільніках нарэшце з'явіцца опцыя «замена чужых мелодый на гудкі»?

У рэстаране.
— А вашы катлеты сапраўды з рабчыкаў?
— Ну, увогуле, так. Праўда мы дадаём да іх і іншае мяса.
— Якое?
— Каніну.
— А прапорцыя якая?
— 50 на 50. Адзін рабчык — адзін конь.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 61, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.941. Індэкс 63850. Зак. № 3459.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 жніўня 2013 года.